МУЖЫК З ЖОНКАЙ СВАРЫЦЦА — У ГАРШЧКУ ТРАСЦА ВАРЫЦЦА



Па гарызанталі: 4. Адно дзіця — не дзіця, двое дзяцей — паўдзіцяці, ... дзяцей — гэта дзіця (прык.). **5.** Часам ... горш, чым дурата (прык.). **7.** Тэатральная п'еса жартлівага зместу. **9.** ... — як дурная жонка: ці з розуму звядзе, ці сілу скрадзе (прык.). **10.** За бацькава сварыцца — і ..., і грэх (прык.). **12.** Зваранай рыбе ... не патрэбна (прык.). **13.** Чорт бяду перабудзе — ... згіне, дзесяць будзе (прык.). **14.** Дзе двое — там ..., дзе трое — там здрада (прык.). **15.** Чым за морам ... піць, лепш з Нёмана вадзіцу (прык.). **16.** ... не раве, толькі спаць не дае (прык.). **18.** ... з галавы псуецца (прык.). **19.** Мужчынскае імя ў некаторых краінах. **20.** Вышэйшы тытул манарха. **26.** Смачны жабе ..., ды зубоў Бог не даў (прык.). **27.** «Распачне мужык сварыцца -\\... змаўчаць баіцца,\\Часам і наадварот». З верша А. Церашковай «Мужык і жонка». **28.** У чужым баку ... па кулаку (прык.).

Па вертыкалі: 1. На чужы ... гузіка не нашыеш (прык.). **2.** Гарачы напітак з рому, каньяку або гарэлкі, змешаны з вадой і цукрам. **3.** Добрая жонка — дома ..., злая — хоць ты цягу дай (прык.). **4.** Мужык з жонкай сварыцца — у гаршчку ... варыцца (прык.). **5.** ... мядзведзі ў адной бярлозе не зімуюць (прык.). **6.** Орган размнажэння ў грыбоў. **8.** Такая праўда, як ... сякеру з'еў і дзёгцем запіў (прык.). **11.** Спроба — не ... (прык.). **12.** І ў харошай сям'і ... бывае (прык.). **15.** Напалоханая ... і вераб'я баіцца (прык.). **17.** Праснуўся ў свіньня ... (прык.). **21.** Жонка як кветка, а ... — шкарпэтка (прык.). **22.** Той, хто імкнецца атрымаць за сваю работу больш, чым яна каштуе (разм.). **23.** ...! Воклiч з пераможнай інтанацыяй. **24.** Пакуль на гумне ..., патуль на стале хлеб (прык.). **25.** Ведаў ..., каму не даў рог (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:
Па гарызанталі: 4. Трое. 5. Дабрата. 7. Фарс. 9. Самагонка. 10. Смех. 12. Вада. 13. Адна. 14. Рада. 15. Віно. 16. Доўг. 18. Рыба. 19. Карл. 20. Імператар. 26. Арэх. 27. Жонка. 28. Вочы.
Па вертыкалі: 1. Рот. 2. Грог. 3. Рай. 4. Трасца. 5. Два. 6. Аск. 8. Сабака. 11. Хвароба. 12. Вырадак. 15. Варона. 17. Галасы. 21. Муж. 22. Рвач. 23. Ага! 24. Цэп. 25. Бог.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Заход	Даўжыня дня
Мінск —	7.13	19.23	12.10
Віцебск —	7.02	19.13	12.11
Магілёў —	7.03	19.13	12.10
Гомель —	6.59	19.09	12.10
Гродна —	7.28	19.38	12.10
Брэст —	7.29	19.38	12.09

Месяц

Поўня 16 сакавіка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Марыі, Ксеніі, Васіля, Емяльяна, Мікалая, Паўла, Яўгена.*
К. *Аляксандры, Клаўдзіі, Святланы, Анатоля, Вінцэнта.*

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

Міжнародны дзень шчасця. Устаноўлены рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі ААН ад 12 ліпеня 2012 года, якая абвясціла, што «дасягненне шчасця — фундаментальная мэта чалавека». Дата свята — дзень вясновага раўнадзенства — сімвалізуе думку аб тым, што на шчасце мае роўныя правы любы жыхар Зямлі, незалежна ад расы, колеру скуры, сацыяльнага становішча.

1547 год — нарадзіўся (Польшча) Мацей Стрыйкоўскі, гісторык і паэт. З 1570 года жыў у Беларусі і Літве. Выклаў кароткую гісторыю Польшчы і ВКЛ у вершаванай хроніцы «Ганец цноты...» (1574), частка твора пад назвай «Генеалогія, або Кароткае апісанне вялікіх князёў літоўскіх» выдадзена ў 1626 г. у Любчанскай друкарні. Аўтар шэрагу гістарычных твораў, у тым ліку «Аб свабодзе Кароны польскай і Вялікага Княства Літоўскага» (1575). Галоўная праца гісторыка — «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» (1582, беларускі пераклад — 1584 год) — каштоўны дакумент па гісторыі славянскіх народаў, у якім выкарыстаны беларуска-літоўскія летапісы і хронікі. Лічыцца першай друкаванай гісторыяй ВКЛ.



1828 год — нарадзіўся Генрык Ібсен, нарвежскі драматург. Яго жыццё і творчасць напоўнены дзіўнымі супярэчнасцямі. З'яўляючыся палкім прыхільнікам адраджэння нарвежскай нацыянальнай культуры, Генрык Ібсен правёў дваццаць сем гадоў у добраахвотным выгнанні ў Італіі і Германіі. Захапляючыся нацыянальным фальклорам, ён у сваіх п'есах паслядоўна руйнаваў рамантычны арэол народных саг. І, тым не менш, Генрык Ібсен — адзін з заснавальнікаў нарвежскага тэатра. Грандыёзная сіла таленту гэтага драматурга дазволіла яму арганічна злучыць у сваёй творчасці самыя разнастайныя тэмы, ідэі і праблематыку. «Лялечны дом», «Здані», «Пэр Гюнт» — гэтыя п'есы Ібсена ўжо другое стагоддзе знаходзяць свайго слухача і гледача ў тэатрах розных краін свету.

1954 год — 60 гадоў таму нарадзіўся (вёска Бабчын Хойніцкага раёна) Мікола Мятліцкі (Мікалай Міхайлавіч), беларускі паэт. У 1976 годзе скончыў БДУ. Працаваў у газеце «Літаратура і Мастацтва», у выдавецтве «Мастацкая літаратура», з 2002 года — галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Аўтар паэтычных зборнікаў «Мой дзень зямны», «Хойніцкі сшытак», «Ружа вятроў» і іншых. Кніга «Бабчын» — своеасаблівы помнік роднай вёсцы, пакінутай людзьмі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН, палітычны дзеяч, філасаф, ідэолаг Рэфармацыі:

«Шмат хто, папускаючы сваім жаданням
і жарсцям, не вытрымлівае ўмеркаванасці,
якой патрабуе прырода. І тады асалода,
прызначаная на ўмацаванне цела, нясе яму гібель».

Ш А Ш К І

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ВОСЬМЫ ТУР

Яго заданнямі завяршаецца аўтарскі конкурс-17 Пятра Шклудава з Наваполацка *(на фота)*, чэмпіёна свету па шашачнай кампазіцыі ў раздзелах прабблем і эцюдаў-64:

№ 17/23. **Белыя:** d2, f2, g5, g7 (4). **Чорныя:** b2, c5, c7, d6, e7 (5). Выйгрыш.



№ 17/24. **Белыя:** a3, b2, b4, c1, f6, g1, g5, g7, h2, h4, h6 (11). **Чорныя:** b8, d2, d4, d8, e3, f2, f4, f8, g3, h8 (10). Таксама перамога белых.

ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ПАЗІЦЫІ

Неўзабаве мы аб'явім традыцыйны класіфікацыйны конкурс пад эгідай Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Яго пераможцы пацвердзяць званне першакласных рашальнікаў і будуць узнагароджаны. Сёння прапануем разабраць трэніровачныя пазіцыі, падрыхтаваныя вядучым рубрыкі са сваёй практыкі. У іх патрабуецца перайграць чорных:

1. **Белыя:** b2, c7, f4, g3, g5, h4 (6). **Чорныя:** c3, c5, d2, d4, e3, g7, h2, h8 (8).

2. **Белыя:** d2, e7, f2, f6, g1, g7 (6). **Чорныя:** a5, c5, c7, d4, d8, e5, f4, h8 (8).

3. **Белыя:** b2, c1, h6, дамкі d4, e1 (5). **Чорныя:** a3, c7, e7, f4, h8, дамкі a5, b4 (7).

ↄↄↄ

Адказы цягам двух тыдняў накіроўвайце на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, газета «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

«Дзіцячы трэнер, прабблеміст» (М. Стэфановіч): **№ 3** — 1. gf8 2. dc7 3. gf2 4. fh6! 5. ed4 6. h6:h2 a7-b6 7. fe7 8. h:a5 hg3 9. ab6 gh2 10. bg1#.

«Аўтарскі-18» (В. Шульга): **№ 18/18** — e7 (g:e1A) a1, h8, a5 (g3) b6 (h2) f4, g1x. A(c:e1) b8, h2, h8, a5 (g3) b6 (h2) f4, g1x, **№ 18/19** — f8 (d6A) h4, g5 (g3, d4) f6 (g5) c3, e1x. A(a7:c5) d6, h4 (e3B) e1 (g5) c3/a5 (f2) g3, c5x. B(g5) f6/d8 (e3) c3 (f2) g3x і **№ 18/20** — 11, 1, 38, 38, 47 (46) 41, 37x.

УСМІХНЕМСЯ

— Мама, я іду гуляць!
— З кім ты ідзеш? А дзе вы будзеце гуляць? Калі прыйдзеш дадому? А на чым паедзеш?
— Тата, я іду гуляць!
— Добра!

У дзесяць гадзін вечара пачаўся бой паміж цяжкавагавікамі — гуртом «Рамштайн» і будаўнічым перфаратарам. У пятым раўндзе абодвум было залічана тэхнічнае паражэнне: хтосьці з суседзяў адключыў рубільнік.

Муж прыязджае з рыбалкі з поўны заплечнікам рыбы.
Жонка ў захапленні:
— Вось гэта ўлоў!

Муж, стомлена:
— Дык, халера, гарэлку дома забыліся...

Шыльда на бензакалонцы:
«Курэнне падчас запраўкі можа дапамагчы кінуць курыць назаўжды!»

Гэтая дата лічыцца заканчэннем астранамічнага года, таму людзі, народжаныя ў гэты дзень, значна адрозніваюцца ад іншых. Яны шчодра адораны разнастайнымі талентамі, летуценнасцю і аптымізмам. Часта, пераацэньваючы нечыя магчымасці, яны пачынаюць недаацэньваць сябе, набываючы комплекс непаўнавартасці. Вялікую ролю ў іх жыцці адыгрываюць сябры і калегі, якія могуць падтрымаць і выцягнуць з дэпрэсіі. Зрэдку праяўляюць сябе як псіхолагі, падтрымліваюць і суцяшаюць тых, каму гэта неабходна. Яны надзеленыя экстрасэнсорнымі якасцямі, вельмі адчувальныя да мастацтва. Калі народжаныя ў гэты дзень змогуць выкарыстаць свае таленты, яны дасягнуць вялікіх поспехаў у жыцці.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара— галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 1141.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 сакавіка 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12